**Багдановіч, Э.** Грознымі дарогамі Афгана/ Э. Багдановіч // Міёрскія навіны. – 2006. – 14 лют. – С. 3.

## ГРОЗНЫМІ ДАРОГАМІ АФГАНА



*Гэтая сустрэча праходзіла ў кабінеце галоўнага інжынера ПМК-55 Леаніда Ігнатавіча Касевіча, які, па сутнасці, і арганізаваў яе, за што яму асабістая ўдзячнасць. І выбар кандыдатуры Івана Юзэфавіча Юхно аказаўся ўпаўне вартым таго.*

*З характарыстыкі, дарэчы, вельмі станоўчай, якую даў падначаленаму Л. І. Касевіч, стала вядома, што працуе Іван Юзэфавіч у ПМК-55 ужо амаль 14 гадоў. І за ўвесь гэты час ні разу не скампраметаваў сябе.*

*– Гэта выключна сціплы, добрасумленны і вельмі адназны чалавек, – не раз падкрэсліваў Леанід Ігнатавіч. – А таму і карыстаецца асаблівым аўтарытэтам у калектыве. Наогул, арганізацыя ў нас вялікая, але вось такіх людзей, як І. Ю. Юхно, няшмат. І мы гэтых надзейных работнікаў цэнім, бо ім у любых, у тым ліку і экстрэмальных сітуацыях можна давяраць поўнасцю.*

*Недахоп майстроў, прарабаў на будаўнічых аб'ектах, безумоўна, ускладняе работу. А таму замест іх брыгадзірам нярэдка даводзіцца прымаць самастойныя рашэнні. І заўсёды граматна, кваліфікавана атрымліваецца гэта ў І. Ю. Юхно. Наогул, яго брыгада спецыялізуецца на нулявых цыклах, інжынерных сетках. У брыгадзе людзі працуюць на поўную нагрузку, ніколі не ўзнікае збояў і прастояў. І ўсё таму, што побач знаходзіцца брыгадзір, які дэталёва разбіраецца ў тэхнічнай дакументацыі, здольны самастойна працаваць з кантрольна-вымяральнымі прыборамі.*

*Гэта толькі некаторыя моманты з характарыстыкі. І, карыстаючыся выпадкам, Л. І. Касевіч выказаў жаданне павіншаваць усіх воінаў-афганцаў з іх святам, бо на долю гэтай катэгорыі юнакоў у свой час вылалі асаблівыя выпрабаванні.*

*– І гэтыя выпрабаванні яны з гонарам вытрымалі, – адзначыў Леанід Ігнатавіч. – На жаль, не ўсім давялося вярнуцца з вайны жывымі, шмат засталося параненых і інвалідаў. Але 15 лютага для кожнага з былых афганцаў – асаблівы. У гэты дзень яны штогод разам наведваюць магілкі загінуўшых сяброў і «братоў». Франтавсй чаркай памінаісць усіх, каму не давялося вярнуцца жывымі, нагадваюць былыя ўспаміны. Няхай сёння менш турбуюць незагойныя раны ў сэрцах і душах воінаў-інтэрнацыяналістаў. Здароўя ўсім і ўсяго самгга найлепшага! – заключыў ён.*

Нарадзіўся Іван Юхно 38 гадоў назад у гарадскім пасёлку Лынтупы, што ў Пастаўскім раёна. У 6-гадовым узросце страціў бацьку. Так і рос у маці адзіным сынам, яе ўцехай і дарадцем. Пасля заканчэння 8 класаў уладкаваўся будаўніком у суседнюю будаўнічую арганізацыю, якая размяшчалася... на літоўскай тэрыторыі, бо да мяжы не перабольшвала і 3 кіламетраў. У гэтай жа арганізацыі працавала і маці Івана.

Вось так пачаў Іван сваю працоўную біяграфію бетоншчыкам, а сярэднюю адукацыю атрымліваў у вячэрняй школе. Да таго ж, спалучаў вучобу з курсамі аўтамабіліста. Да 18-годдзя ўжо меў правы вадзіцеля.

13 красавіка 1986 года – прызыў у армію. Са шкадаваннем развітваўся юнак з маці, супакойваў яе, як умеў. А самому ўсё ж хацелася хутчэй ступіць на тады яшчэ невядомую вайсковую сцежку, спазнаць салдацкае жыццё. Толькі не ведаў пра жахі, якія чакалі яго наперадзе, бо з'яўляўся сынам звычайнай рабочай, простым хлопцам, у якога не было і не магло быць дзесьці «шырокіх плячэй», якія б абаранілі яго ад ваеннага пекла, якім і стала афганская вайна.

Аддаць доўг радзіме, служыць чэсна, сумленна, пераносіць вайсковыя выпрабаванні Іван быў маральна гатовы з самага пачатку. Правільна лічыў, што кожны сапраўдны мужчына павінен прайсці армейскую школу. І ўсё – дзеля радзімы, дзеля народа. Інакш нельга, бо ён – юны патрыёт. Не адмовіўся выконваць інтэрнацыянальны абавязак, бо гэта абавязак, і гэтым сказана ўсё. Хаця, пасутнасці, ішла чужая вайна. Але аб гэтым будзе сказана пазней. Можна аспрэчваць, наколькі апраўдана ці неапраўдана. Аднак, ведаючы, што іх дапамогі чакае афганскі народ, салдаты не збочылі з дарогі.

З Віцебска Іван быў накіраваны ва Узбекістан, горад Фергана. Паўгода знаходзіўся ў вучэбным цэнтры паветрана-дэсантных войск. Праходзілі падрыхтоўку. Аў кастрычніку разам з іншымі салдатамі Іван самалётам быў дастаўлены на афганскую тэрыторыю. Што ён там убачыў? На гэты конт Юхно параіў паглядзець фільм «9-я рота».

– Вельмі праўдзівы фільм, – падкрэсліў былы афганец. – Усё, як і на самой справе было.

У Афганістане маладое папаўненне размеркавалі па ротах. Іван Юхно трапіў у першы батальён 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі, 350-ы полк, і як называлі яго ў салдацкім асяроддзі – «полтинник».

Іван успамінае, што было там больш тысячы юнакоў з Саюза (беларусы, украінцы, узбекі, літоўцы...).

На «ЗІЛе-131», які прыняў Юхно ад дэмбеля, перавозіў боепрыпасы, прадукты харчавання ад савецкай граніцы. Аднак пачынаў хлопец вайну не вадзіцелем, а аўтаматчыкам. Тады ён разам з іншымі хадзіў на баявыя заданні. Небяспека падпільноўвала на кожным кроку. «Духі» – так называлі мясцовых душманаў, узброены былі дастаткова добра. Да таго ж, у схватках праяўлялі асаблівую жорсткасць і напорыстасць.

Кроў, боль, смерць... Спачатку для Івана ўсё бачыць было проста невыносна. Потым прызвычаіўся. Але, калі гінулі сябры, цудоўныя хлопцы – душа рвалася на часткі. І як шмат іх, юных, добрых і прыгожых, вярталася на радзіму ў цынкавых трунах!

Праз некаторы час стары «ЗІЛ» Івана спісалі. Узамен атрымаў новы, больш магутны «Урал-4320». І ўжо гэтую машыну штораз загружалі снарадамі, боепрыпасамі, на ёй выязджалі салдаты на баявыя заданні.

Ордэнам Чырвснай Зоркі Іван Юзэфавіч Юхно быў узнагароджаны за паспяхова праведзеную аперацыю «Хост». Такую назву меў адзін з афганскіх раёнаў. На брані, танках салдаты прыкрывалі пяхоту, якая рухалася па гарах. Заданне было выканана ўдала.

У красавіку 1988 года Івану давялося суправаджаць калону ад Кабула да Кандагара. Уздоўж дарогі размясціліся на брані. Спусцілася ноч. І ў 2 гадзіны іх калону пачалі абстрэльваць. Прачнуўся юнак ад моцнага выбуху, зусім побач прагучаў стрэл. Убачыў, што суседнюю машыну

поўнасцю ахапіла полымя. «Урал» Івана таксама пачаў загарацца. Хлопец імгненна схапіў аўтамат, перадзёрнуў затзор. І тут – чарговы выбух. Кантужаны юнак бездапаможна ўпаў. Калі ачуняў, то адчуў, як на спіну збака яго машыны сцякае дызельнае паліва. Памятае, што метраў 10 ён яшчэ прабег, аднак, атрымаўшы шматлікае асколачнае раненне рук, жывата, ног, упаў. Бой працягваўся яшчэ хвілін 45. А чацвёртай гадзіне раніцы па рацыі выклікалі верталёт з Кандагара. Івана і раненага афіцэра пагрузілі і накіравалі ў шпіталь. Там адразу ж хлопца адправілі на аперацыйны стол. З цела дасталі вялікую колькасць асколкаў. З 22 красавіка і да 5 мая Івана лячылі. А потым самалётам даставілі ў Кабул. Аднак раненні перашкаджалі хлопцу адчуваць сябе паўнацэнным. На той час Іван моцна кульгаў, балелі ногі, рукі. 11 мая быў дэмабілізаваны. А 13 мая 1988 года вярнуўся дамоў. Майская квецень вітала юнака на роднай зямлі, а больш іншых шчаслівай адчувала сябе яго маці, бо яе сынок, хоць ранены, змарнаваны, але ж вярнуўся з ваеннага пекла жывым. Спатрэбіўся час, каб прыйсці ў норму. А потым Іван зноў пачаў працаваць у ранейшай арганізацыі, толькі ўжо вадзіцелем.

Праз некаторы час жаніўся, завёў сям'ю, стаў уважлівым мужам і клапатлівым бацькам. І цяпер сын-дзевяцікласнік цягнецца да бацькі, бачачы ў ім не толькі выхавацеля, але і старэйшага сябра. Іван Юзэфавіч турбуецца аб будучыні сына, бо наперадзе ў хлопца лёсавызначальны перыяд – паступленне ў навучальную ўстанову, працаўладкаванне.

Надзейны прытулак у доме Івана знайшла цяпер ужо нямоглая маці. Яна акружана ўвагай і цеплынёй, клапатлівым доглядам.

У святочныя і ўрачыстыя дні ўпрыгожваюць грудзі былога воіна ўзнагароды. А іх багата – ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», чатыры юбілейныя медалі. Зіхацяць яны, падкрэсліваючы вартасць уладальніка, чалавека, заслугоўваючага пашаны і павагі.

Жыццё працягваецца. І былы воін-афганец – Іван Юзэфавіч Юхно працягвае тварыць дабро на зямлі, а значыць, жыве дастойна і пачэсна.

***Э. Багдановіч***